біблейскія матывы: Хрыстовых хаджэнняў па пакутах, Тайнай вячэры, святых апосталаў, святой Марыі (перадусім выяўляюцца ў фільмах «Маці ўрагану» і «Жыцце і ўзнясенне Юрася Братчыка»).

Такім чынам, можна вызначыць асноўныя архетыпічныя вобразы і матывы ў экранізацыях У. Караткевіча і сродкі іх мастацкага ўвасаблення. У. Караткевіч – творца еўрапейскага маштабу, чые творы насычаныя нацыянальным каларытам і своеасаблівыя тым, што натуральным чынам спалучаюць у сабе універсаліі еўрапейскай культурнай прасторы і нацыянальныя адметнасці, якія ў сваю чаргу выяўляюцца ў вобразах персанажаў, створаных пісьменнікам.

У кінастужцы «Дзікае паляванне караля Стаха» можна вылучыць архетып Зоны (палац Яноўскіх і ў цэлым маёнтак Балотныя Яліны), архетып Ценю, які адначасова нясуць ў сабе ажно тры персанажы-носьбіты: Надзея Яноўская (вобраз Блакітнай Жанчыны, якая ўвасабляе ўнутраныя страхі і ваганні гераіні), Базыль Гацэвіч (вобраз Маленькага Чалавека, прадвесніка бяды і хуткай смерці) і Дзікае паляванне (містычны вобраз жаху). Некаторыя персанажы маюць складаную архетыпічную структуру. Так, вобраз Яноўскай таксама, як і ўдавы Кульшы, Ігната Гацэвіча і Андрэя Свеціловіча, нясе ў сабе архетып Ахвяры. А вобразы караля Стаха і Дубатоўка яднаюць у сабе як архетып Смерці, так і архетып Ахвяры. Сутнасць архетыпічных вобразаў выяўляецца ў сцэнах-дамінантах, дзе іх эмацыйныя, духоўныя існасці дасягаюць апагею мастацкага выяўлення. Да такіх сцэнаў адносіцца сцэна «палявання здзічэлых вершнікаў» на ўдаву Кульшы і паўстання сялян супраць палявання («Дзікае паляванне караля Стаха»).

У кінастужцы «Маці ўрагану» Васіль Вецер з'яўляецца носьбітам архетыпаў Змагара, Духа і Самасці і ўвасабляе персаніфікаваны вобраз Свабоды, нязменна знітаваны з Маці-зямлёю. Маці Агна, тройчы пераўвасабляючыся, адпавядае тром архетыпічным сутнасцям у трох ключавых сцэнах-дамінантах: у першай сцэне-дамінанце Маці Агна ўвасабляе саму беларускую зямлю; у другой сцэне-дамінанце Агна далучаецца да сялян і авалодвае смяротным дакрананнем пракажонага разам з сынам Васілём (тут Агна асацыіруецца са святой ахвярнай вар'яткай-Маці, якая выпраўляе свайго сына на смерць дзеля ўратавання іншых людзей); у трэцяй сцэне-дамінанце паказана, як пасля смерці Васіля Ветра маці Агна прамаўляе перад княжым атачэннем маналог і «адорвае пацалункам смерці» кожнага, хто варты яго за свае ўчынкі (у дадзеным выпадку Агна паўстае здратаванаю і спакутаванаю душою, ўвасабляючы і Маці-зямлю, і маці Збаўцы, і адначасова маці-пакутніцу забітага сына). У фільме Самасць Ветра «адлюстэркаваецца» у Маці Агне, нібыта ён жывіцца сілаю менавіта з яе. І персаніфікаваны вобраз Свабоды, увасаблянікам якога з'яўляецца Васіль, «прарастае» менавіта з Агны. Такім чынам, паказана ўзаемадзеянне і ўзаемапранікненне двух персанажаў, якія з'яўляюцца носьбітамі самых асноўных архетыпаў – Сына і Маці, разам з тым утрымліваючы у сваіх ўзаемадачыненнях і ўчынках відавочную рэлігійную алюзію.

У кінатворы «Жыцце і ўзнясенне Юрася Братчыка» вобраз галоўнага героя «мужыцкага Хрыста» – увасаблянік архетыпаў Духа, Самасці і Змагара. Можна нават казаць пра ўвасабленне нацыянальнай Самасці ў гэтым вобразе. Сцэна звароту Юрася Братчыка да сялян з'яўляецца ў гэтай стужцы дамінантнай.

На працягу даследавання вызначана, што у экранізацыях твораў У.Караткевіча некаторыя архетыпы (якія па сутнасці з'яўляюцца універсальнымі: архетыпы Смерці, Маці, Самасці і інш.) набылі ўласна нацыянальныя прыкметы і афарбоўку (вобраз Васіля Ветра, Юрася Братчка, Маці Агны, Дзікага палявання і інш.). Іх можна разглядаць на двух узроўнях: вычляняць універсаліі, а таксама казаць пра нацыянальную адметнасць. Некаторыя настолькі пераўвасобіліся і ўвасобіліся ў вобразы і сімвалы беларускага мастацтва, кіно, культуры, літаратуры, што на першы план выступае менавіта іх нацыянальная своеасаблівасць. Не столькі этнічная, колькі выпрацаваная самім У.Караткевічам, якая трывала ўвайшла ў нацыянальную свядомасць. У. Караткевіч стварыў мысляформы, што трывала ўвайшлі ў беларускае мастацтва. Яны ўвасоблены ў спадчыне творцы ў выглядзе архетыпічных вобразаў і матываў.

©ПГУ

## ПЛАНИРОВОЧНАЯ СТРУКТУРА ПОЛОЦКА В IX–XIII вв

***Т. А. КУШАКОВА,*** **А. С. ДАВИДОВИЧ, Т. Л. ДАВИДОВИЧ**

In this article the development of Polotsk's planning structure from the time of town creation till the 13th century the formation of town center and monumental buildings are studied

Ключевые слова: детинец, городище, замок, посад

Полоцк был основан как укреплённое поселение полоцких кривичей в междуречьи рек Полоты и Западной Двины. Со временем его районы переместились и на противоположные берега этих рек, где возникли посады: Великий, Заполотский, Островской, Кривцов, Слободской, Экиманский.

Возникновение города берёт своё начало от древнего городища, которое располагалось на левом берегу Полоты. Оно представляло собой поселение мысового типа, которое с трёх сторон было окружено водами реки. Для восточно-европейских городов было характерно наличие около укреплённого городища ремесленного посадского поселения. В 1986 г. такое поселение было найдено на территории Нижнего замка. Ещё в 1978г. Г. Штыховым было найдено небольшое ремесленное поселение на правом берегу Полоты [1, с. 7].

Таким образом, в IX – начале X вв. городская территория включала: древнее укреплённое городище на левом берегу Полоты, посад на территории Нижнего замка и поселение на правом берегу Полоты. Городище и поселение были соединены между собой, а не разделялись, как в наше время, руслом Полоты.

В IX в. Полоцк начал развиваться по веерно-радиальной системе, характерной для многих славянских городов, с центром в древнем городище. Город занимал компактную территорию, которая была вытянута вдоль русла Полоты по направлению к Западной Двине.

В конце X – начале XI вв. происходит резкое увеличение городской территории. В X в. городские посады вышли далеко за пределы древнейшего окольного города около городища. Город вырос и включал в себя территорию Верхнего замка, центральную часть Великого посада, половину территории позднейшего Заполотского посада, участок правого берега Полоты [2, с. 36].

В XI в. происходят значительные перемены в общей планировочной структуре города. Нарастание диспропорций между укреплённым центром и торгово-ремесленными посадскими поселениями привели к переносу укреплённого замка на новое место – Верхний замок, который становится центром Полоцка. В XI в. в новом укреплённом центре Полоцка сооружается архитектурная домината – Софийский собор. На Верхний замок была перенесена и княжеская резиденция с древнейшего полоцкого городища.

В XII–XIII вв. центральная, западная, северо-западная части Верхнего замка сохраняют функции административно-духовного и светского центра города. Кроме Софийского собора, в XII в. на Верхнем замке возводится ряд монументальных сооружений. В первую очередь это церковь, являющаяся прообразом церкви Михаила-Архангела в Смоленске, а также княжеский терем на северном краю площадки замка. Очевидно, что этими сооружениями не ограничивалось количество построек на Верхнем замке, что подтверждают результаты раскопок [2, с. 63].

В этот период начинают активно разрастаться посады, возникают сельские предместья, в пригородах появляются монастыри. В XII–XIII вв. город состоит из укреплённого детинца – Верхнего замка, Великого и Заполотского посадов, возникают монастыри в Бельчицах и Сельце, возможно, на Острове. В XIII в. территориальное расширение всего Полоцка остановилось.

**Литература**


1. *Тарасаў С. В.* Новае ў археалогіі Полацка //Полоцкий летописец. историко-литературный журнал №1.– Полоцк, 1992.
2. *Тарасаў С. В.* Полацк IX–XVII стст. Гісторыя і тапаграфія.-Мінск: «Беларуская навука», 1998.


©ПГУ

## АДРАДЖЭННЕ СПАСА-ЕЎФРАСІННЕЎСКАГА МАНАСТЫРА НАПРЫКАНЦЫ XX СТАГОДДЗЯ

***Г. М. ЛАБОХА,*** **Д. У. ДУК**

This work is dedicated to revival and development Polock Savior-Evfrosinevsky female monastery at the end of the XX century

Ключавыя словы: Спаса-Праабражэнская царква, «Цёплая царква», Свята-Крыжаўзвіжанскі храм, Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр

Са змяненнем палітыкі дзяржавы ў дачыненні да царквы ўжо ў 1988 г. Мінскае епархіяльнае ўпраўленне паставіла перад уладамі пытанне аб аднаўленні дзейнасці Полацкага Спаса-Еўфрасіннеўскага жаночага манастыра. У гэты час саюзнікам праваслаўных вернікаў выступілі Саветы па справах рэлігій у Мінску і Маскве, якія ішлі насуперак патрабаванням партыйных органаў не рэгістраваць тыя ці іншыя прыходы.

4 жніўня 1990 года Савет па справах рэлігіі пры Савеце Міністраў СССР зарэгістраваў Спаса-Еўфрасіннеўскі жаночы манастыр. Па блаславенню Свяцейшага Сінода РПЦ, дадзенаму 6 ліпеня 1989 г., у Спаскім манастыры пачаліся рамонтна-рэстаўрацыйныя работы [1, ф. 658, воп. 6, спр. 965]. Напачатку адраджэння манастырскага ансамбля перад духоўным кіраўніцтвам Полацкай епархіі паўсталі шматлікія перашкоды. У той час, калі манастыр не дзейнічаў, у двухпавярховы будынак, дзе